# БРУК

НЕ СЯДЗІЦЦА Ў ХАЦЕ ХЛОПЧЫКУ МАЛОМУ

23 ЛЮТАГА — ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ АРМ11..........

ЗАПРАШАЕМ У ГЭТЫ ДЗЕНЬ ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ У

СЬВЯТОЧНЫМ ПАЦЫФ1СТЫЧНЫМ МАРШЫ ПАД ЛЁЗУНГАМ1

Наблiжалася сьвята 23 лютага.
Мiж слупоў i на гаўбцах ужо боўталася звыклае ўпрыгожаньне гарадзкога пэйзажу — чырвоныя транспаранты: "Слава... Слава... Слава..."
Хiба маглi мы ўхiлiцца, не далучыцца... Н е  м а г л i. Як кажуць, ня мелi права.

Перакiнуўшыся такiмi-сякiмi нефармальнымi iдэямi, самыя галавастыя з нас склалi ўлётку i плян сьвяткаваньня...
На Рэзон-анс разьлiчваць не даводзiлася, тым ня менш адная баявая газэта нашую акцыю ўпiльнавала i, побач зь паэмай пра масавыя адстаўкi абкамаў, зьмясцiла аналiтычны артыкул.

"Чем же привлёк внимание общественности этот митинг? Пожалуй, театральностью. Ряженые в полувоенную, без знаков различия форму, в солдатских шапках-ушанках и невесть откуда добытых "жолнерских" конфедератках, участники антивоенного шоу вначале пели частушки, читали стишки, острили, гримасничали. Затем дружной гурьбой двинулись по Ленинскому проспекту в сторону Минского Дома офицеров. Как сказал лидер "ряженых" студент Сергей Витушка "... чтобы попеть, потанцевать и выкурить с "вайсковцами" трубку мира"." "Сквозь бал-маскарад, разыгранный активистами конфедерации белорусских "суполок" красной нитью проходила идея пацифизма."



"БЕРИ ШИНЕЛЬ, ПОШЛИ ДОМОЙ"

"ЗБРОЮ НА МЫЛА!"

"М1Л1ТАРЫЗМ — СТОП!"

"ПРЫЙШОЎ ЧАС ЛЮБ1ЦЬ, А НЕ ЗАБ1ВАЦЬ"

Сапраўды, усё было досыць мiла, вясёла i трохi несур"ёзна. Але жаданай мэты мы дасягнулi, бо спадар капiтан /аўтар аналiтычнага артыкула/ "возвращался домой мучительно размышляя..."
І хоць сам факт разважаньня, няхай сабе спачатку i пакутлiвага, нас узрадаваў, дык далейшы яго ход засмуцiў. Не зразумеў капiтан паклiканьнi гарачых сэрцаў.

— Наш пацыфiсцкi "зялёны" рух — зусiм не рэвэранс модзе. Гэта шчырае жаданьне быць людзьмi гуманнымi,— тлумачыць нам гаспадар адной з жаўнерскiх канфэдэратак Вiтушка. — Але перакананьнi за дзень не складваюцца. Той ваяўнiчы дух, якiм нас загружалi "саветы" адразу ня вытруцiш.



Рэдакцыя: Паводле выслоўяў сп. капiтана антываенныя акцыi ў нас наогул ня маюць сэнсу. Дзяржава дастаткова клапоцiцца аб мiрным небе i прыклад таму вывад войска з Афганiстана, скарачэньне ўзброеных сiл i г.д.

Вiтушка: А цi ня стануць новымi "афганiстанамi" Закаўказьзе, Прыбалтыка, урэшце, Беларусь, дзе воля карэнных народаў будзе душыцца танкамi вялiзнай iмпэрыi?

Рэдакцыя: А як стасуюцца антываенныя патрабаваньнi з заклiкамi стварацць нацыянальнае войска? "Неувязочка", як сказаў бы капiтан.

Вiтушка: Думаю, нам бы хапiла невялiчкай прафэсыйнай нацыянальнай гвардыi, якая б несла ганаровую варту ля прэзыдэнцкага палаца i на межах самастойнай Беларусi.

## УСПАМ1НЫ ВЭТЭРАНА РУХУ

## АЛЕСЯ М1ХАЙЛАВ1ЧА СУШЫ.........................

<u>Рэдакцыя</u>: Калісьці Уладзімір Жылка напісаў:"О, Вільня, крывіцкая Мэкка!" 1 сапраўды, кожны сьвядомы беларус рвецца туды ў паломніцтва. Але, відаць, ня толькі Вільня ёсьць такая "Мэкка". Напэўна галоўнае— зрабіць паломніцтва...

<u>Вэтэран</u>: Так, падарожжа па сьвятых мясьцінах багата дае. Пабываўшы ў Полацаку, Смаленску, ці ў той жа Вільні, пагаварыўшы з тамтэйшымі, вяртаешся ў Менск і ўжо няглездзячы на атмасфэру агульнага "чигириканья" пачуваеш сябе нармальным беларусам.

<u>Рэд.</u>: Алесь Міхайлавіч, вы былі адным з піонэраў першай канфэдэрацкай вандроўкі па Дзьвіне. Можа якія-небудзь рэтраспэкцыі ўсплывуць з вашай памяці?

<u>В.</u>: Гэта была адная з найбольш яркіх вандровак.

<u>Рэд.</u>: Пасьля вандроўкі "Дзьвіна-Даўгава-87" на нас навешвалі ўсе сьмяротныя нацыяналістычныя грахі. Мы, канечне, адбрэхваліся. Але цяпер, можа, прыйшла пара прызнацца ды пакаяцца — быў-такі нацыяналізм?

<u>В.</u>: Папраўдзе, нездарма-такі ўспудзіўся менскі гаркам. Усе гэныя намёкі на нацыянальную сымболіку — белыя палотнішчы з чырвонаю эмблемаю. На вятры яны маглі здацца нацыянальным сьцягам. Нам, прынамсі, гэтага хацелася і мы гэта бачылі, хоць аб"ектыўнаму воку больш нагадвалі японскі сьцяг.

<u>Рэд.</u>: Дзядзька Алесь, у вас за плячыма доўгі жыцьцёвы шлях і багаты досьвед. Вандруючы з вамі, мы вучыліся, засвойвалі такія-сякія правілы вандровак-тусовак. Дык, можа, падзяліцеся яшчэ разок вопытам.

<u>В.</u>: Галоўнае правіла — "як карта ляжа". Турыст-спартовец ідзе па компасе, ён ня можа адхіліцца ад азымуту, яму хочацца перці, каб пот хвастаў, каб цяглііцы рваліся.

Нашыя вандроўкі — гэта зусім ня тое. Нас вёў ня компас, наш азымут — жыцьцёвыя сытуацыі, неспадзяванкі. Гэта быў самы-самы цымус нашых бадзянак, гэта давала эстэтычную асалоду, нянюханыя пахошчы, так сказаць...............................

Другое правіла — "рух накладваецца на рух". Калі ў вандроўках трымаешся папярэдняга правіла, дык заўсёды даводзіцца пад"язджаць: аўтобусам, спадарожнай машынай, трактарам, на кабыле... Галоўнае — не стаяць!!!

1 нарэшце трэцяе правіла — "галоўнае— дробненька нарэзаць". Прадуктаў стараемся не набіраць, каб не тарабаніць цяжкія заплечнікі. Але, калі згаладалыя спыняемся і дастаем харч, душу агортвае туга і вярэдзяць подлыя інстынкты. Тады галоўнае — дробненька накроіць, каб вока супакоіць.

<u>Рэд.</u>: 1 на заканчэньне гутаркі давайце памарым. Уявім сабе, што яшчэ доўга ў нашай краіне 1,2-га траўня будуць адзначацца як сьвяточныя выхадныя дні. Можа, тады травеньскія вандроўкі, як калісьці па Дзьвіне, Прыпяці, па Ракаўшчыне, па Лідчыне, стануць традыцыйнымі ў маладзёжным адраджэнцкім руху?

<u>В.</u>: Бадай што, стануць. 1 нават калі адмовіцца ад камуністычных сьвятаў, то прыйдзецца замяняць іх нечым іншым, напрыклад, Вялікоднымі вакацыямі. А як выпадае вольная хвіліна і на двары вясновая цяплынь, дык чаго ў хаце сядзець — гайда на Гайнаўку!




— Можа хоць гэты падвязе?.......

## КОН-КУРС "ВАЛАЦУГА 90"

ВЫ ЖАДАЕЦЕ НАХАЛЯВУ ЗЬЕЗЬДЗ1ЦЬ У БЕЛАСТОК?

ТАДЫ ЎЗГАДАЙЦЕ САМЫ НЕЗВЫЧАЙНЫ ВЫПАДАК З ВАШАГА ВАНДРОЎНАГА ЖЫЦЬЦЯ.

ПЕРАМОЖЦА КОНКУРСА АТРЫМАЕ ПУЦЁЎКУ НА РЭЙД "БАЦЬКАЎШЧЫНА",

ЯК1 ЛАДЗ1ЦЬ БЕЛАРУСКАЕ АБ"ЯДНАНЬНЕ СТУДЭНТАЎ

## ЖУЕ БЕЛАРУСЬ!........................

Сабраліся аднаго разу нацдэмы на бясе-ду-пачостку. Вядома, панабралі гарэлкі, закускі. Накрылі на стол, паселі, а іхны завадатар, раскаркоўваючы пляшку, распачаў сваю нетаропкую гаворку:

— Учарайшую газэту чыталі? Зноў пра нашыя сымболі пішуць. Брэшуць, гады, адны так, другія гэтак, а праўды ніхто ня кажа. А чаму ж такі мілы беларускай душы нацыянальны сьцяг? Скуль гэнтыя калёры?

А я ведаю! Тут усё проста. Уся праблема ад сала,— з гэтымі словамі дзяцюк узяў сьцізорык і падсунуў бліжэй да сябе вялікі кавалак саланіны.

— Вы думаеце чаму беларус такі трывалы? Бо сала жарэ, і на поўну губу, а хлеба так, толькі дзеля смаку. Усё ад сала, нават прымаўка: "трэба есьці сала, каб душа сьпявала!"

Дык калі адрэзаць ад добрай полкі сала ладны скрыль,— хлопец адкроіў духмяную, зь перцам і кменам, белую лусту, у сярэдзіне якой чырванела мясная праслоечка,— убачым мы цудоўнае спалучэньне колераў. Тое самае, роднае — бел-чырвона-белае!!! Гэтым і тлумачыцца, даражэнькія, усенародная адвечная любоў беларусаў да свайго сьцягу.

Пасьля гэтае лекцыі ўся кампанія ўхвальна загаманіла. Старшыня ўзяў у адну руку чарку, у другую відэлец з лустай нацыянальна сьведамага сала, узьняў яго ў гору, нібы штандар, і гучна абвясьціў:

— Ну што ж, пачнем з традыцыйнага тоста. За Айчыну! Жуе Беларусь!!!

— Жуе!— грымнула грамада..............




— Усё зьеў бы!

— А губа не завернецца?.............

## ЧАС КАХАЦЬ, А НЕ ЗАБІВАЦЬ.......



Пол Мортан. 1988 г.

Ядзерныя ракетныя базы, як галубы, абсеселі ўсю Эўрапэйскую частку СССР. І каля 40% гэтага экскрэмэнту выпала на нашу родную старонку, перадусім на Берасьцейшчыну ды Гарадзеншчыну, а ў другой лініі: Віцебшчыну, Меншчыну, Магілёўшчыну і Гомельшчыну.

Першая паласа паўзе ад Маларыты, Слабодкі, Засімавічаў, Броннай Гары, Пінску, Ружанаў, Слоніма, Ліды, Ге галаў да Смаргоні і Паставаў.

Другая паласа: Жыткавічы, Мазыр, Петрыкаў, Рэчыца, Гомель, Жлобін, Слуцак, Бабруйск, Лапічы, Ветрына, Станькова і Менск.

Ля Броннае Гары што на Берасьцейшчыне, звалена аж 170 ракет.

## ДАГАНЯЮЧЫ НЕ НАЦАЛУЕШСЯ....

Дубовыя мы людцы, беларусы! Ня ўмеем расслабіцца. А часам так хочацца... аддацца... і магчымасць жа ж была: адна салідная маскальская фірма прапанoўвала свае паслугі......— сов-дэп-дыснэй-лэнд! Парк цудаў пад Ракавым.

1 замест таго, каб уважліва прачытаць сакрэтны службовы дакумент "Задание на разработку дизайн-проекта", мы наладзілі марш-пратэст.

Каб вы пераканаліся, які шанец летась мы задушылі сваімі ж рукамі, падаем цытаты з вышэйпамянёнага дакумэнту.

СОСТАВ РЕКРЕАЦИОННОЙ ЗОНЫ:

Спортивная зона....Большое количество водных аттракционов, интимных и массовых видов транспорта на воде и под водой.

Зооботаническая зона. Разместить огромное количество цветов и фонтанов. Сблизить людей и животных.

Зона истории. Невообразимое смешение стилей, занятий, языков — малый Вавилон. По-человечески шумно и "кишаще".

ПИТАНИЕ.

Питание осуществляется в густой сети неповторимых заведений. Избыточно много заведений. Есть ночные. Очередей нет. Туалетов достаточно и чисто.

ПРОЖИВАНИЕ.

Основная часть отдыхающих — это люди, прибывающие на два и более дней. К их услугам кемпинги, санатории, частные владения, ночные, с расчётом на последующий /?/ сон, аттракционы.

Основное требование — зона рекреации должна быть проникнута духом оптимизма. Удивление, радость и восторг должно всё вызывать у каждого. Плюс ощущение свободы.

Развить идеологию размещения отелей, кемпингов, бунгало и пр.

Разработать потоки посетителей, транспорта. Решить проблему мусора.

Мероприятия должны быть таковы, чтобы человека в парке окружала сплошная приятность.

Техническое задание не ограничивает фантазию авторов.

## АФАРЫЗМЫ САВЕЦКІХ АФІЦЭРАЎ.........

-стой там, слушай сюда!

-ядерная бомба всегда попадает в эпицентр.

-чтобы я ни одного личного состава в казарме не видел.

-ты у меня смотри, я где нормальный, а где и беспощаден

-всех отсутствующих в одну шеренгу!

-доложить о наличии людей! кто не все, того накажем

-здесь не Англия — копать надо глубже.

-или вы прекратите курить, или одно из двух

-в роте 7 разгильдяев, а ты волосы на пробор носишь.

-короткими перебежками от меня до следующего дуба

-что вы матом ругаетесь, как маленькие дети

-сержант, у вас дневальный не стрижен, на ушах стоит

-все наши неприятности от того, что верхняя пуговица расстёгнута.

-каждый курсант должен быть либо поощрён либо наказан

-сначала пройдут люди, а потом поедим мы.

-горло болит? учите уставы — болеть не будет.

-и не делайте умное лицо, не забывайте, что вы будущий офицер!

-взвод! спиной к друг другу в шахматном порядке по диагонали становись!

-возьмите уставы и перепишите всё наизусть.

-выступаем вечером, на рассвете.

-автомат ставьте на колено левой руки.

-это вам чревато боком.

-куст — это пучок растений, произрастающих из одной точки.

## ДАПІШЫ САМ.........




АД РЭДАКЦЫІ: думкі аўтараў не заўсёды супадаюць з тым, што надрукавана ў газэце.

ГАЗЭТУ БРУКАВАЛІ: Сяржук Вітушка, Алеся Сёмуха, Дзяніс Раманюк /мастак/